МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

19 красавіка 2017 г.
№ 13 (397)

Патрэбна дарога́, але не до́рага

стар. 3

Была школа — стала крама

стар. 7



Унікальная гісторыя аднаго гарадка

стар. 8

ГАЛОЎНАЯ ТЭМА

АРТЭРЫІ ДЗЯРЖАЎНАГА ЗНАЧЭННЯ

Фота Анатоля КПЕШЧУКА.

Сёлета з рэспубліканскага фонду і рэгіянальных бюджэтаў на паляпшэнне мясцовых дарог накіруюць каля 120 млн рублёў

У першай дэкадзе красавіка кіраўнік дзяржавы ўзняў пытанне якасці і рамонту магістраляў раённага маштабу і сельскіх дарог. Работы плануюцца грунтоўныя, бо ступень зносу палатна вялікая.

Сапраўды наша краіна мае дастаткова развітую сетку аўтамабільных дарог агульнага карыстання. Іх працягласць складае 71 тысячу кіламетраў. Мясцовыя дарогі ў Беларусі звязваюць паміж сабой 23 тысячы населеных пунктаў, у тым ліку 199 гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, каля 1,4 тысячы аграгарадкоў, 21,8 тысячы вёсак і сельскіх населеных пунктаў. Нельга не ўлічваць пад'езды да прамысловых, сельскагаспадарчых аб'ектаў. Зразумела, усе гэтыя дарогі час ад часу патрабуюць рамонту, ад элементарнага ямачнага да капітальнага.

Дарэчы, шчыльнасць дарожнай сеткі ў Беларусі самая высокая сярод краін СНД. У свеце пакуль па гэтым паказчыку лідзіруюць Бельгія, Нідэрланды і Германія. А ў нас ёсць два трансеўрапейскія калідоры, Захад — Усход і Поўнач — Поўдзень, якія звязваюць Расію і Еўрасаюз, Фінляндыю, Літву, Малдову, Румынію, Балгарыю і г. д. Сёння мы не проста транзітная дзяржава, а з нядаўняга часу яшчэ і важнае звяно праекта новага Шаўковага шляху.

Так адбылося, што апошнім часам удзяляецца вялікая ўвага развіццю сеткі рэспубліканскіх аўтамагістраляў краіны, а пытанні мясцовых дарог адышлі на другі план. Гэта прывяло да з'яўлення справядлівых нараканняў з боку насельніцтва на стан дарожнай сеткі ў рэгіёнах. Па розных ацэнках, ад шасці да дзесяці тысяч кіламетраў дарог патрабуюць неадкладнага рамонту. Міністэрства транспарту падлічыла, што кожны 8-ы кіламетр мясцовых дарог знаходзіцца ў дрэнным стане, а калі пакрыццё не аднаўляць своечасова, то выдаткі на рамонт ўзрастуць у 2,5—3 разы. Спецыялісты адзначаюць, што каля 80% такіх трас выкарыстоўваюцца з пратэрмінаванымі рамонтнымі тэрмінамі. Амаль палова з іх капітальна не рамантавалася на працягу 20—30 гадоў. Менавіта ім дарожнікі ўдзяляюць увагу ў найбліжэйшы час.

стар. 3

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

ВАКОЛ МІНСКАГА МОРА...

У жыхароў сталіцы і навакольных вёсак вялікай папулярнасцю карыстаецца адпачынак на Заслаўскім вадасховішчы, або, як яго любоўна называюць у народзе, на Мінскім моры. За савецкім часам тут было пабудавана нямала спартыўных баз, аздараўленчых лагераў, пансіянатаў, санаторыяў. Ды з цягам часу яны прыходзілі ў непрыгоднасць, пуставалі. А некаторыя арганізацыі ўвогуле імкнуліся ад іх пазбавіцца, паколькі яны прыносілі страты. Цяпер за прывядзенне аб'ектаў у належны выгляд узяліся абласная і раённая ўлады. Распрацавана цэлая канцэпцыя развіцця тэрыторый вакол вадасховішча. У найбліжэйшай перспектыве тут будзе наведзены парадак. Наш карэспандэнт пабывала на берагах «мора», каб на свае вочы пабачыць зрухі ў гэтым кірунку.

Яшчэ два гады таму на месцы, дзе запланавана рэканструкцыя спартыўнага аздараўленчага комплексу міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО», панавала цішыня. Як кажуць, ні машын, ні людзей. Цяпер жа зрухі відавочныя.

— Спартыўна-аздараўленчы комплекс знаходзіцца ў аператыўным упраўленні ўніверсітэта, яго ўласнік — Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, — праводзіць экскурсію **першы намеснік прарэктара «МІТСО» Аляксандр ЛАШЧЫНСКІ.** — Аб'ект будуецца ў дзве чаргі. Паводле планаў, першая будзе здадзена сёлета. Корпус разлічаны на 52 спальныя месцы, а кафэ на 25 чалавек. Ужо падведзены газ, вада, электрычнасць, засталіся толькі пусканаладачныя работы. Аб'ект абсалютна аўтаномны: ёсць уласная электрападстанцыя.

Другая чарга — непасрэдна добраўпарадкаванне тэрыторыі, уладкаванне пляцовак для гульні ў валейбол і баскетбол, прычалу. І будзе ўсё гэта ўведзена ў дзеянне да 2020 года.

— А чаму не раней? — пацікавілася ў Аляксандра Аляксеевіча.

— Прычына ў бюракратычных працэдурах. На тэрыторыі комплексу ёсць яшчэ і старыя аб'екты, якія неабходна зносіць. Шмат часу адбірае падрыхтоўка і зацвярджэнне праектна-каштарыснай дакументацыі. А мы не можам даваць неабгрунтаваных абяцанняў. Калі ставім задачы, то павінны іх выканаць у азначаны тэрмін.

стар. 2